Зацвярджаю
Начальнік аддзела адукацыі,
спорту і турызму
І.В. Асташэвіч
“ “ кастрычніка 2017 г.

.

**Заданні школьнага этапу рэспубліканскай алімпіяды**
**па беларускай мове і літаратуры 2017/2018 навучальны год**
**Комплексная работа**
**11 клас**

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Балы | | | | | | | | | | | |

**Заданне 1. Запішыце ў транскрыпцыі падкрэсленыя словы. Растлумачце, у якой сітуацыі ўжываюцца прыведзеныя прыказкі.**

1) Зняўшы галаву, па валасах не плачуць. 2) З песні слова не выкінеш. 3) З харастве вады не нап’ешся. 4) Без хлеба яда – да парога хада.

| | Транскрыпцыя | Сітуацыя |
|---|---|---|
| 1. | | |
| 2. | | |
| 3. | | |
| 4. | | |

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

**Заданне 2. Падбярыце перыфразы да наступных слоў.**

Неба–______________________________;

жаўранак - ______________________________ ;

лес–______________________________ ;

бабёр-______________________________;

зязюля-______________________________;

вайна – ______________________________;

бульба–______________________________;

радзіма – ______________________________ .

*Максімальная колькасць балаў –4.*

**Заданне 3. Дзеяслоў** біць **мае больш за 10 значэнняў, сярод якіх:** 'наносіць удары, збіваць каго-н.', "наносіць паражэнне', 'страляць, абстрэльваць' **і інш. У спалучэнні з якім назоўнікам гэты дзеяслоў мае значэнне –** "святкаваць перамогу' і 'празмерна хваліцца чым-небудзь'**? Запішыце словазлучэнне.**

______________________________________________

*Максімальная колькасць балаў – 2.*

**Заданне 4. Прачытайце тэкст. Знайдзіце словы з арфаграфічнымі памылкамі. Выпішыце іх у табліцу і растлумачце правапіс.**

Нядаўна яшчэ тут шумела залатым калоссем збажына, а над ёй, у шырокім блакіце неба, незмоўклымі званочкамі ліліся песні вясновых жаўрукоў.

У канцы лета жыта зжалі і па ўсім полі паставілі залацістыя сцірты духмянай саломы.

У адно вераснёўскае ранне ўвесь ржэўнік раптам застракацеў рамонкам. Яго столькі тут закрасавала, што поле зрабілася белае.

Летам густая збажына ўсё цяпло забірала, недаючы кветкам падняць да сонца свае белыя галоўкі. Цяпер жа рамонкі дружна застракацелі на пачэрнелым ржэўніку.

| Слова з арфаграфічнай памылкай | Нарматыўнае напісанне | Правіла |
|---|---|---|
| | | |

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

**Заданне 5. Запішыце фразеалагізмы з кампанентам вецер, якім адпавядаюць наступныя лексічныя значэнні.**

| **Значэнне фразеалагізма** | **Фразеалагізм** |
|---|---|
| 1) 'у каго-небудзь няма грошай' | |
| 2)'хто-небудзь вельмі легкадумны, несур'ёзны' | |
| 3) 'назад не вернеш, не знойдзеш каго- | |

| | |
|---|---|
| небудзь; пра безнадзейныя пошукі каго-небудзь’ | |
| 4) ‘рабіць што-небудзь сабе на шкоду’ | |

*Максімальная колькасць балаў – 4 (1 бал – за кожны правільна ўказаны фразеалагізм).*

**Заданне 6. Перакладзіце на беларускую мову. Словазлучэнні запішыце ў левы слупок, а спалучэнні слоў, якія не з’яўляюцца словазлучэннямі, – у правы.**

В зависимости от сведений, благодаря соседу, не обращать внимания на жару, в течение зимы, исходить из соображений, ответить на запрос, исходя из соображений, благодарить товарища, наподобие гриба, испытать беду.

| Словазлучэнні | Спалучэнні слоў |
|---|---|
| | |

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

**Заданне 7. Выкарыстоўваючы галоўную частку «Вясна яшчэ вернецца», складзіце складаназалежныя сказы са значэннем умовы, прычыны, мэты, уступкі.**

______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

**Заданне 8. Суаднясіце словы і прыведзеныя значэнні.**

| | |
|---|---|
| А) тэрцэт<br>Б) трыпціх<br>В) трылогія<br>Г) трыо<br>Д) дактыль<br>Е) амфібрахій | 1) тры адносна самастойныя творы, якія аб’ядноўваюцца ў адзіны цыкл агульнасцю задумы, галоўных герояў, пераемнасцю сюжэта;<br>2) трохскладовая стапа, дзе націскным з’яўляецца першы склад;<br>3) трохрадкоўе; |

| | |
|---|---|
| | 4) ансамбль з трох выканаўцаў;<br>5) паэтычны твор з трох адносна самастойных вершаў;<br>6) трохскладовая стапа, дзе націскным з'яўляецца другі склад. |

*Максімальная колькасць балаў –3.*

**Заданне 9. Запоўніце пропускі ў наступных выказваннях.**

1)________________________ – творы старажытнай літаратуры, у якіх запіс дакладных звестак пра пэўныя падзеі, сведкам якіх быў летапісец, спалучаўся з літаратурна апрацаванымі паданнямі пра падзеі ранейшыя, мінулыя.

2) Шматзначны вобраз, від іншасказання, які асноўваецца на падабенстве ці агульнасці прадметаў, з'яў і заключаецца ва ўмоўным абазначэнні сутнасці якой-небудзь з'явы, у літаратуры называецца ___________________________.

3) ______________________ – урачысты, узнёслы верш у гонар нейкай з'явы, падзеі ці асобы.

*Максімальная колькасць балаў – 3 (1 бал – за кожнае правільна адноўленае слова).*

**Заданне 10. Па фактах біяграфіі, творах, некаторых характарыстыках "пазнайце" пісьменніка. Устанавіце адпаведнасць і запішыце адказ у форме "лічба – літара" (напрыклад, 6Е).**

| | |
|---|---|
| **1.** Сын беззямельнага арандатара, затым – сам дробны арандатар, чорнарабочы бровара, бібліятэкар, супрацоўнік, а пасля і рэдактар адной з першых легальных беларускіх газет. | **А.** Алесь Бачыла |
| **2.** У Адэсе прайшло яго "першае маленства". На пятым годзе жыцця апынуўся ў Беларусі, у вёсцы Загора. Гэта "другое маленства", што ўвайшло ў памяць і ўразіла багаццем прыроды, яркасцю і арыгінальнасцю беларускіх народных святаў, звычаяў, прыгажосцю роднай мовы. | **Б.** Кандрат Крапіва |
| **3.** Толькі ў 1911 г., пасля заканчэння ніжагародскай гімназіі, лёс падараваў яму першую свядомую сустрэчу з роднай Беларуссю. | **В.** Янка Брыль |

| | |
|---|---|
| **4.** Майстар байкі, неперайзыдзены сатырык у паэзіі, прозе, драматургіі; яго слова ў навуцы таксама было важкім і значным, асабліва для свайго часу. | **Г.** Янка Купала |
| **5.** Стварыў “энцыклапедыю сялянскага жыцця”. | **Д.** Якуб Колас |
| **6.** Сюжэтнасць верша, напеўнасць радка далі магчымасць многія яго вершы пакласці на музыку (“Радзіма мая дарагая” і інш.). На беларускую мову перакладаў творы рускіх, украінскіх, латышскіх паэтаў, “Залаты ключык, або Прыгоды Бураціна” А. Талстога і інш. | **Е.** Максім Багдановіч |

*Максімальная колькасць балаў – 6 (1 бал – за кожную правільна ўстаноўленую адпаведнасць).*